# ВЫХАВАННЕ Ў ДЗЯЦЕЙ ПАЧУЦЦЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ, НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ, ПАВАГІ ДА РОДНАЙ КРАІНЫ, ДА ЯЕ КУЛЬТУРЫ І СПАДЧЫНЫ СРОДКАМІ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

*Есіпёнак Юлія Міхайлаўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца праблема выхавання патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, павагі да роднай краіны, яе культуры у дзяцей дашкольнага ўзросту сродкамі розных відаў музычнага мастацтва. Прапанаваны вопыт арганізацыі музычнай дзейнасці з выхаванцамі старшай групы – план-канспект тэматычнага занятка "Музыка краіны сінявокай" як частка сістэмы заняткаў адукацыйнай галіны "Музычнае мастацтва". Матэрыялы адрасаваны музычным кіраўнікам устаноў дашкольнай адукацыі.*

Выхаванне нацыянальнай самасвядомасці падрастаючага пакалення – адна з самых актуальных задач нашага часу. За мінулыя гады адбываліся вялікія змены ў адносінах людзей да нашай гісторыі, пераацэнка маральных каштоўнасцей. Нажаль, у наш час матэрыяльныя каштоўнасці дамініруюць над духоўнымі, а ўяўленні аб дабрыні, вялікадушшы ў дзяцей часта бываюць скажонымі.

Дашкольнае дзяцінства з'яўляецца першай і вельмі важнай ступенню ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці дзіцяці. Менавіта дашкольны ўзрост – важнейшы перыяд станаўлення асобы, калі закладваюцца перадумовы якасцей чалавека-грамадзяніна, развіваюцца ўяўленні дзяцей аб чалавеку, грамадстве і культуры.

Сродкамі выхавання любові да Радзімы з'яўляецца мастацкае слова, музыка, мастацтва, традыцыі, гістарычныя веды, таму што яны дапамагаюць дзецям эмацыянальна ўспрымаць навакольнае асяроддзе. Акрамя гэтага выхаваўчымі сродкамі выступаюць дзейнасць (гульня, праца), святы, якія спраўляюцца ў краіне і дзіцячым садзе.

На занятках адукацыйнай вобласці "Музычнае мастацтва" вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі выхаванцы знаёмяцца з беларускімі нацыянальнымі інструментамі, танцамі, песнямі, гульнямі праз праектную дзейнасць, а таксама праз святы і забавы.

У ДУА "Дзіцячы сад №8 г. Полацка" з мэтай ажыццяўлення патрыятычнага выхавання дзяцей распрацаваны праект "Музыка краіны беларускай", які рэалізуецца на працягу некалькіх гадоў. Складаючымі праекту з'яўляюцца наступныя падпраекты: "Родныя напевы" прысвечан беларускай народнай песні; "Цымбалы – музычны сімвал Беларусі" ,"Грайце, музыкі!" прысвечаны азнаямленню з народнымі інструментамі, "Народная гульнятэка" прысвечан народным гульням; "Музычнае падарожжа па Беларусі", "Разам спяваем, танцуем, гуляем", "У нашай хаце сёння свята" прысвечаны святам, забавам беларусаў.

Выкарыстанне на музычных занятках відэапрэзентацый дае магчымасць выхаванцам акунуцца ў мір музыкі: пабываць на канцэртах ансамбляў і аркестраў беларускіх народных інструментаў, найбольш цесна пазнаёміцца з дзейнасцю танцавальных калектываў Беларусі, паслухаць беларускія народныя і аўтарскія песні ў розных выкананнях. Распрацаваны прэзентацыі "Аркестр беларускіх народных інструментаў", "Музыка родная гучыць", "Танцы Беларусі", "Запаведны напеў", "Музычная гасцёўня", "Беларускі нацыянальны касцюм" і інш.

Вырыстанне інтэрактыўных, музыкальных і музыкальна-дыдактычных гульняў дапамагае дзецям замацаваць атрыманыя на занятках веды.

Напярэдадні Міжнароднага дня музыкі, які штогод адзначаецца 1 кастрычніка, у ДУА "Дзіцячы сад №8 г. Полацка" быў праведзены тэматычны занятак для выхаванцаў старэйшай групы, які стаў вынікам кароткасрочнага праекту "Музыка краіны сінявокай". Прапануем канспект тэматычнага занятка для азнаямлення.

Адукацыйная галіна "Музычнае мастацтва".

Тэма: "Музыка краіны сінявокай".

Праграмныя задачы:

самастойна знаходзіць магчымасці выкарыстоўваць раней вывучаныя песні;

фарміраваць уменне ўспрымаць танцавальную музыку ў адзінстве з рухамі, выконваць танцавальныя рухі лёгка, пластычна ва ўмераным і хуткім тэмпе; правільна ўжываць прыёмы гуказдабывання пры выкананні мелодыі на музычных інструментах;

працягваць развіваць уменне выхаванцаў адрозніваць і называць характар і настрой праслуханнага музычнага твору;

развіваць эмацыянальна пазітыўныя адносіны да розных жанраў музычнага мастацтва, музычнай творчасці;

выхоўваць станоўчыя адносіны да беларускай нацыянальнай культуры, пачуццё патрятызму і нацыянальнай самасвядомасці.

Абсталяванне: дзіцячыя музычныя інструменты, мультымедыйная ўстаноўка, музычны цэнтр, рознакаляровыя ноты (для кожнага выхаванца), відэазапіс цымбальнага ансамбля, відэазапіс аркестра беларускіх народных інструментаў, фанаграма песні "Мікіта", фанаграма песні "Заіграй жа мне, дударочку", фанаграма "Лявоніха", шырма.

**Ход занятка**

*Пад беларускую музыку дзеці збіраюцца ў музычнай зале. Іх сустракае музычны кіраўнік у касцюме гаспадыні беларускай хаты.*

**Музычны кіраўнік:** Вітаю вас, дзеці. Я вельмі рада бачыць вас у сябе ў гасцях, у маёй беларускай хаце. Сёння мы наш занятак прысвецім беларускай музыке. Адкажыце мне, калі ласка, як называецца наша краіна? *(Рэспубліка Беларусь)*. А як мы называм музыку нашай краіны? *(Беларусская музыка)*. Як называецца музыка, якая складзена не асобнымі аўтарамі, а народам нашай краіны? *(Беларуская народная музыка)*. Ці ведаеце вы якую-небудзь беларускую песню? *(Да)*. Вось я вам і прапаную пачаць з песні "Мікіта".

ПЕСНЯ "Мікіта"

**Музычны кіраўнік**: Як вы лічыце, па якіх сімвалах нашу краіну пазнаюць ва ўсім свеце? *(Бусел, зубр, бульба і інш.)* А які музычны інструмент можна назваць сімвалам Беларусі? *(Цымбалы)* Так. Цымбалы – гэта беларускі народны музычны інструмент. І зараз мы разам з вамі яшчэ раз атрымаем асалоду ад яго гучання.

СЛУХАННЕ "Беларускія танцы" І. Жыновіч (відэазапіс)

**Музычны кіраўнік**: Вось такі цудоўны музычны твор мы з вамі паслухалі. А што вы можаце сказаць пра характар і настрой гэтай музыкі? *(Адказы дзяцей)*. Так, музыка была хуткая, прыгожая, вясёлая, жвавая. танцавальная. Малайцы.

Беларуская народная музыка вельмі разнастайная па характару і настрою. А як вы лічыце, што можна рабіць пад яе? *(Адказы дзяцей)* Беларускі народ заўсёды любіў танцаваць, а таму зараз я і вам прапаную вывучыць беларускі народны танец "Лявоніха".

ТАНЕЦ "Лявоніха"

**Музычны кіраўнік**: Малайцы, вы вельмі стараліся, прыгожы танец у нас атрымаўся. А якія беларускія музычныя інструменты вы ведаеце? *(Адказы дзяцей)*. Вы ўспомнілі і цымбалы, і гармонь, і лыжкі, і дуду, і жалейку, і баян, і трашчотку, увогуле шмат музычных інструментаў. А зараз мы разам ўспомнім, як гучаць некаторыя інструменты і пагуляем у гульню "Адгадай, што гучыць".

МУЗЫЧНАЯ ГУЛЬНЯ "Адгадай, што гучыць".

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, адкажыце, калі ласка, як мы называем калектыў музыкаў, якія адначасова іграюць на розных музычных інструментах? *(Аркестр)*. А хто з'яўляецца кіраўніком аркестра? *(Дырыжор)*. Так, верна. Зараз я прапаную вам паслухаць аркестр беларускіх музычных інструментаў.

СЛУХАННЕ (па выбару музычнага кіраўніка)

**Музычны кіраўнік**: Быць музыкантам аркестру вельмі складана і адказна. Для таго, каб музычны твор атрымаўся прыгожым, усе удзельнікі *(музыканты)* аркестра павінны чуць адзін аднаго і заўсёды бездакорна выконваць ўсё, што паказвае ім дырыжор. Зараз мы разам з вамі паспрабуем стаць сапраўдным аркестрам: вы станеце музыкантамі, а я буду вашым дырыжорам.

АРКЕСТР "Зайграй жа мне, дударочку"

**Музычны кіраўнік:** Які цудоўны аркестр у нас атрымаўся! Вы малайцы, слухалі адзін аднаго, былі вельмі ўважлівымі і таму, добра справіліся с гэтым нялёгкім заданнем.

Дзеці, што мы сёння рабілі на занятку? *(Адказы дзяцей)*.

А скажыце, якая наша родная Беларусь і як мы павінны адносіцца к сваёй Радзіме? *(Адказы дзяцей)*.

А што вы скажаце пра нашу беларускую музыку, якая яна? *(Адказы дзяцей)*.

Якое заданне вам здалося самым цяжкім? *(Адказы дзяцей)*.

А якое спадабалася больш за ўсё? *(Адказы дзяцей)*.

Я падрыхтавала для вас рознакаляровыя ноткі і прапаную кожнаму з вас выбраць сабе нотку: калі вам спадабалася – жоўтую, а калі вам было трохі сумна і не зусім цікава – чырвоную *(дзеці выбіраюць ноткі)*. А на наступным занятку мы з вамі больш падрабязна пазнаёмімся з яшчэ адным вельмі прыгожым і цікавым інструментам, які называецца *жалейка*. Да пабачэння.

Пад музыку дзеці пакідаюць музычную залу.

Такім чынам, падчас занятку дзеці ўспомнілі беларускія народныя інструменты і мелі магчымасць адчуць сябе музыкантамі аркестру. Беларускія песні, беларускія танцы, гульні, якія выконваліся на занятку, вызывалі ў дзяцей станоўчыя эмоцыі, зацікаўленнасць. Свае ўражанні дашкольнікі адлюстравалі ў малюнках, якія былі прадстаўлены на выставе "Музыка краіны сінявокай".

Патрыятычнае выхаванне ажыццяўляецца не толькі на музычных занятках, але і ў паўсядзённым жыцці дзіцяці ў дашкольнай установе і грунтуецца на цесным супрацоўніцтве ўсяго педагагічнага калектыва, з актыўным уключэннем у адукацыйны працэс бацькоў, што дазваляе кожнаму дзіцяці адчуць сабе сапраўдным беларусам, які паважае і ганарыцца культурай і спадчынай сваёй роднай страны.

### Спіс літаратуры

1. Александровіч, Р.А. Зямля з блакітнымі вачыма: дапаможнік для педагогаў дашкольных устаноў / Р.А. Александровіч [і інш.] – Мінск, 2001. – 83 с.

2. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі для ўстаноў дашкольнай адукацыі з беларускай мовай

навучання і выхавання [Элекронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://adu.by/images/2022/08/up-doshk-obrazov-rus-bel.pdf. – Дата доступа: 01.10.2022.
3. Красюк, В.С. Сімвалы Беларусі: дапаможнік для педагогаў дашкольнай адукацыі на рускай і беларускай мовах / В.С. Красюк. – Мінск, "Экоперспектива", 2017. – 110 с.
4. Мой край завецца Беларуссю: дапаможнік для педагогаў установ, якія за-бяспечваюць атрыманне да¬школьнай адукацыі / аўт.-укл. А.І. Красіла. – Мазыр, 2004. – 89 с.
5. Мой родны кут…: зб. метадычных матэрыялаў па патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту: у 2 ч. / склад. В.В. Мініна. – Мазыр: ТАА ВД – «Белы Вецер», 2007. – 303 с.
6. Никонова, Л.Е. Патриотическое воспитание детей старшего дошкольного возраста: пособие для педагогов / Л.Е. Никонова. – Минск: Народная асвета, 1991. – 112 с.
7. Спадчына маёй краіны: матэрыял для азнаямлення дзяцей з гісторыяй і культурай Беларусі: у 2 Ч. / склад. І.К. Грышкевіч. – 2-е выд. – Мазыр, 2006. – 124 с.

*Дата поступления в редакцию: 10.10.2022*

Дадатак






# ВОСПИТАТЕЛЬНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ ПАМЯТИ О ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ: ИЗУЧЕНИЕ ГЕРОИЧЕСКОЙ ИСТОРИИ РЕГИОНА С ПОМОЩЬЮ СОВРЕМЕННЫХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ

*Кутынко Александр Александрович*

***Аннотация.*** *Рассматриваются вопросы сохранения исторической памяти, формирования патриотизма и активной гражданской позиции у молодежи. Автор анализирует воспитательный потенциал военной тематики, предлагает методические рекомендации из опыта работы с использованием новых образовательных технологий – исторического блогинга.*

В Год исторической памяти актуальным является вопрос не только сохранения памяти о событиях Великой Отечественной войны и увековечения их, но и внедрение новых методик для популяризации героических страниц войны для формирования чувства патриотизма и активной гражданской позиции у подрастающего поколения. Особенно эффективно изучение событий Великой Отечественной войны на местном, краеведческом материале.

Современные образовательные программы учреждений общего среднего и дополнительного образования позволяют уделять достаточно времени формированию устойчивой идейно-гражданской позиции молодежи, формированию высоких духовно-нравственных и патриотических качеств личности. Например, разделы курса обществоведения в IX–XI классах посвящены темам государственности, Конституции и др. [7, с. 140].

В учебных программах по истории Беларуси особое внимание уделяется событиям Великой Отечественной войны, актуальным вопросам генезиса Республики Беларусь на современном этапе; с 2022/2023 учебного года обязательным стало изучение событий Великой Отечественной войны на факультативных занятиях в IX классах. Во всех учебных программах объединений по интересам Витебского областного дворца детей и молодежи также уделяется значительное внимание патриотическому воспитанию молодежи, сохранению исторической памяти о событиях Великой Отечественной войны.

В огромном воспитательном потенциале данной тематики сегодня мало кто сомневается. Свидетельствует об этом и государственная политика Республики Беларусь.

Белорусы с трепетом относятся к увековечению жертв Великой Отечественной войны, сохранению памяти о них, об их героическом подвиге. Уже 3 июля 1944 г., фактически в первые часы после освобождения Беларуси, вышло подписанное секретарем ЦК КП(б) БССР П.Пономаренко постановление № 5 «О захоронении павших в борьбе с немецкими захватчиками бойцов и офицеров Красной Армии». Текст документа был краток: «Обязать областные, городские и районные партийные и советские организации немедленно проверить все места боев, проходивших на их территории, и при обнаружении незахороненных бойцов и офицеров Красной Армии, павших в борьбе с немецкими захватчиками, организовать похороны с возданием должных почестей. Захоронение производить на видных и хороших местах, с постановкой памятников, оград и приведением могил в надлежащий порядок» [4]. 6 июля 1944 г. появилось постановление № 6 «О сохранении и уходе за местами захоронения воинов Красной Армии и партизан, погибших